# Паўтараем арфаграфію ў загадках

## Урок беларускай мовы ў II класе

### Тэма. Паўтарэнне вывучанага

***Мэты:***

• паўтарыць спосаб праверкі перадачы на пісьме парных па звонкасці і глухасці зычных гукаў перад зычнымі і на канцы слоў;

• паўтарыць правапіс галосных ***о, э, а*** і ***е, ё, я***, галосных пасля няпарных цвёрдых зычных, падоўжаных зычных, раздзяляльных знакаў;

• замацоўваць уменні выдзяляць гукі ў слове, абазначаць іх літарамі ў адпаведнасці з вывучанымі нормамі беларускага правапісу;

• развіваць арфаграфічную пільнасць;

• узбагачаць слоўнікавы запас вучняў назвамі гародніны;

• развіваць мысленне, звязнае маўленне, памяць;

• выхоўваць уважлівасць, сабранасць.

***Абсталяванне:*** індывідуальныя карткі з крыжаванкай, загадкамі, карткі самааналізу.

**1. Арганізацыйны момант.**

Чуйце, хлопчыкі, дзяўчаткі!
Прапаную вам загадкі
Для гульні цікавай новай —
Трэніроўкі разумовай.
*Кандрат Крапіва.*

— Сёння на ўроку мы з вамі будзем паўтараць некаторыя правілы правапісу, вывучаныя ў II класе. І ў гэтым нам дапамогуць загадкі.

**2. «Загадкавы» слоўнікавы дыктант.**

— Спачатку давайце ўспомнім слоўнікавыя словы, якія вы ведаеце. Будзем пісаць слоўнікавы дыктант, але незвычайны — «загадкавы».

Я вам буду загадваць загадкі, а вы запісвайце словы-адгадкі ў крыжаванку. Калі правільна запішыце адгадкі, то даведаецеся, дзе мы апынемся далей.

Кожны вучань запаўняе крыжаванку на індывідуальнай картцы. Адзін вучань запісвае слоўнікавыя словы-адкадкі ў крыжаванку на адваротным баку дошкі.

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 **г** | а | р | б | у | з | |
| | 2 л | **а** | с | т | а | ў | к | а |
| | | 3 **р** | у | к | з | а | к | |
| | 4 д | **о** | ж | д | ж | | | |
| 5 в | і | **д** | э | л | е | ц | | |

1. Таўстунчык паласаты
На семечкі багаты,
Абжыўся ў агародзе,
А хвост — вісіць на плоце.
*М. Маляўка.*

2. Востры хвост,
Нібыта вілы,
Дзіўны выгін маюць крылы.
Прыляціць да нас калі —
Лепіць дом сабе з зямлі.
*М. Пазнякоў.*

3. Ці малы я, ці вялікі —
Ды заўсёды ўсё ж мяне
Людзі носяць
На спіне.
*М. Пазнякоў.*

4. Ходзіць па даху,
Па вуліцы, полі...
Ног у яго —
Не палічыш ніколі.
*М. Пазнякоў.*

5. Кожны дзень са зброяй гэтай
Я палюю на катлеты.
З першай спробы ў іх пацэліць
Вастразубы мой...
*А. Церашкова.*

Пасля запаўнення крыжаванкі вучні параўноўваць свой запіс з запісам на дошцы, выпраўляюць памылкі.

**3. Работа па тэме.**

— Вы правільна адгадалі загадкі, запоўнілі крыжаванку і ўжо здагадаліся, што мы будзем «вандраваць» па гародзе.

У гародзе каля градак
Шмат цікавых ёсць загадак.
А хто градкі даглядае,
Той загадкі адгадае.
*Р. Барадулін.*

***Самастойная работа па картках.***

Дзецям раздаюцца карткі, на якіх запісаны загадкі.

*Варыянт 1*

Са стручка
Цягні на гра..ку
Сакавітую адга..ку.
Як гузак
Табе на ло..,
Нечакана вылез...(*боб*).
*У. Мазго.*

*Варыянт 2*

Прысеў пад плотам
Рыжы ко..,
Павесіў доўгі хвос..
На пло...(*Гарбуз.*)
*М. Пазнякоў.*

— Прачытайце загадкі.

— Якія літары трэба пісаць на месцы пропускаў? Чаму? Вусна падбярыце праверачныя словы да слоў з прапушчанымі літарамі.

— Словы-адгадкі запішыце разам з праверачнымі словамі.

— Прачытайце і адгадайце загадку.

На градзе доўгі, з..лёны,
А ў бочцы ён — с..лёны. *(Агурок.)*

— Вызначце месца націску ў словах з прапушчанымі літарамі. Запішыце гэтыя словы, устаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце іх правапіс.

***Фізкультхвілінка.***

| | |
|---|---|
| Ладачкі-ладкі! | *Вучні крочаць на месцы і пляскаюць у далоні,* |
| Мы палолі градкі, | *згінаюць пальцы рук у кулачок і выпрамляюць,* |
| Мы палолі самі, | *згінаюць пальцы рук у кулачок і выпрамляюць,* |
| Сваімі рукамі. | *згінаюць пальцы рук у кулачок і выпрамляюць.* |
| Ад старанай працы | *Вучні падскокваюць на месцы 3 разы.* |
| Выраслі на градцы: | *Падумаюцца на дыбачкі і паказваюць памер рукамі:* |
| Вось такія буракі! | *разводзяць рукі ў бакі і апускаюць іх,* |
| Вось такія агуркі! | *разводзяць рукі ў бакі і апускаюць іх.* |
| А капусты качаны — | *Вучні на дыбачках цягнуцца як мага вышэй.* |
| Вось такой велічыні! | *Вучні на дыбачках цягнуцца як мага вышэй.* |

*І. Муравейка.*

— Успомніце цвёрдыя зычныя гукі, якія не маюць парных мяккіх гукаў. Якія галосныя пішуцца пасля іх?

— Паслухайце загадку.

Выспеў на градзе
Белы чарадзей.
Галава — на славу,
Да зубка зубок —
Добрая прыправа,
А завуць ... *(часнок).*
*М. Пазнякоў.*

— Выразна вымавіце першы гук ў слове-адгадцы. Ён цвёрды ці мяккі?

— Запішыце слова-адгадку. Падкрэсліце галосную літару пасля **ч**.

— Паслухайце загадку.

Як яе не распранаеш,
Ды няма канца і краю.
Не хапае і цярпення,
Нібы ўся яна — з адзення. *(Капуста.)*
*А. Зэкаў.*

— Назавіце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі. Як на пісьме перадаецца падоўжанае вымаўленне гукаў?

— Запішыце словы *адзенне, цярпенне* і падзяліце іх вертыкальнымі лініямі для пераносу.

— Прывядзіце свае прыклады слоў з падоўжанымі зычнымі.

***Калектыўная работа па заданні на дошцы.***

— Прачытайце загадку, запісаную на дошцы.

Адзін л..е,
Другі п..е,
Трэці расце. *(Дождж, зямля, трава.)*

— Якія словы-адгадкі «дапамагаюць» гародніне вырасці? Чым?

— Ці дапамагаеце вы бацькам, дзядулям і бабулям даглядаць гародніну? Як вы гэта робіце?

— Запішыце загадку, устаўляючы раздзяляльны ***ь*** або апостраф. Растлумачце іх правапіс.

**4. Абагульненне і замацаванне па кантрольных пытаннях.**

— Як праверыць правапіс слоў з парнымі звонкімі ці глухімі гукамі на канцы ці ў сярэдзіне слова?

— Якая літара пішацца замест ***е, ё*** ў першым складзе перад націскам?

— Калі ў беларускай мове пішуцца літары ***о, э–а***?

— Якія зычныя гукі ў беларускай мове заўсёды цвёрдыя? Якія галосныя літары пішуцца пасля літар ***р, ж, ш, ч, ц*** і спалучэння літар ***дж***?

— Якія зычныя гукі ў беларускай мове могуць падаўжацца? Як на пісьме перадаецца падоўжанае вымаўленне зычных гукаў?

— Раскажыце правіла правапісу апостафа і раздзяляльнага ***ь***.

**5. Самааналіз ведаў.**

Кожны вучань атрымлівае картку самааналізу.

| Прозвішча і імя вучня ____________ | | |
|---|---|---|
| 1 | Парныя звонкія і глухія зычныя | |
| 2 | ***е, ё — я*** | |
| 3 | ***о, э — а*** | |
| 4 | Галосныя пасля няпарных цвёрдых зычных | |
| 5 | Падоўжаныя зычныя | |
| 6 | Апостраф і раздзяляльны ***ь*** | |

— Паспрабуйце вызначыць свой узровень валодання правіламі, якія мы паўтаралі сёння на ўроку.

Настаўнік тлумачыць пастаноўку пэўнага знака:

+ ведаю правіла і не раблю памылак пры яго выкарыстанні.
? ведаю правіла, але ўзнікаюць цяжкасці на пісьме.
– раблю шмат памылак на гэта правіла.

Вучні запаўняюць картку самааналізу.

**6. Падвядзенне вынікаў урока.**

***Н. М. Антановіч,*** *выкладчык кафедры беларускага і рускага моваазнаўства БГПУ імя Максіма Танка*